# Знакаміты зямляк-літаратар Якаў Раманавіч Брайцаў

***На карце славутых і памятных мясцін Магілёўшчыны Хоцімскі раён нічым адметным не вылучаецца. Хаця і тут сустракаюцца археалагічныя помнікі, прыгожыя і багатыя лясы, маляўнічыя рэкі.***

***У часы былой царскай Расіі Хоцімшчына ўяўляла сабой глухі куток, дзе панавала забітасць, адсталасць, галеча. Культурнае жыццё тут амаль адсутнічала. Невыпадкова ў мінулыя, дарэвалюцыйныя гады, наш край амаль не вылучыў ніякіх талентаў. У далёкай правінцыі дзейнічалі хіба толькі прадстаўнікі дэмакратычнай інтэлігенцыі, якія імкнуліся не толькі далучыць народныя масы да духоўнага жыцця, але і ўнесці свой уласны ўклад у развіццё адукацыі, культуры. Да ліку такіх энтузіястаў можна аднесці майго земляка Якава Раманавіча Брайцава, цяпер амаль забытага рускага празаіка, драматурга і паэта, прадстаўніка вядомай сялянскай "пляяды" пісьменнікаў. Яго можна лічыць першым прафесіянальным літаратарам - ураджэнцам прыбесядскага краю.***

Імя Якава Брайцава ёсць у энцыклапедыях і даведніках беларускіх пісьменнікаў. Спадчына пісьменніка захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Але на сёння ён самы невядомы пісьменнік у нашай краіне.

Беларускі селянін з глухой закінутай дзесьці на ўскрайку Магілёўшчыны вёскі ўпартай працай і стараннай імклівасцю да адукацыі выйшаў у адукаваныя людзі. Брайцаў дасканала ведаў жыццё і побыт вясковага беларускага насельніцтва свайго краю, пільна сачыў за зменай сацыяльных адносін на сяле, а потым адлюстроўваў гэтыя падзеі і з'явы ў шэрагу сваіх твораў.

Свае апавяданні, аповесці і п'есы ён прысвяціў апісанню духоўнага свету і матэрыяльных умоў жыцця сялян і мяшчанства ўсходняй Беларусі эпохі канца прыгоннага права.

Так скалісія абставіны, што свае творы пісьменнік вымушаны быў пісаць на рускай мове. Але ён укладаў шмат слоў, выслоўяў і асобных сказаў, узятых з народнай беларускай мовы. Беларускіх твораў Дуніна-Марцінкевіча і іншых пісьменнікаў таго часу, друкаваных у першых выданнях у большасці лацінкаю, ён, напэўна, не ведаў, а ішоў сапрата, абяцаная вярбоўшчыкам, яго не спакушала. І толькі пасля настойлівых просьбаў Якава (не абышлося без слёз) Раман Рыгоравіч з вялікай неахвотай даў згоду на выдачу пашпарта. У Трасцянцы праслужыў Брайцаў два гады канторшчыкам. Там ён напісаў сваё першае апавяданне "Печать Каина" або "Дудолева лоза" (1881 год).

Праз два гады Брайцаў вярнуўся ў сваё сяло на прызыў у салдаты, але як старэйшага сына хворага бацькі, як кармільца, ад прызыву ў армію яго вызвалілі. Бацька не сварыўся, а хваліўся сынам: зноў марыў ён бачыць сына ўжо валасным пісарам. Вось толькі бацькоўскім марам не суджана было здзейсніцца: Якаву вельмі хацелася вялікага жыцця. Ён задумаў стаць пісьменнікам. У хуткім часе па ўласнай ініцыятыве і наперакор бацьку вырашыў ехаць шукаць шчасця ў Маскву. Ехаць туды, дзе жывуць любімыя пісьменнікі, туды, дзе кіпіць жыццё, дзе бібліятэкі, поўныя кніг пісьменнікаў усіх часоў і народаў.

І вось Якаў прыехаў у Маскву. Перад ім Трыумфальная арка, на Тверской паток людзей, экіпажаў, блішчаць вітрыны магазінаў. Апамятаўшыся, ён павольна пайшоў па вуліцы да цэнтра

"песцікі-тычынкі" мала займаюць. Ён марыць працаваць на літаратурнай ніве. Праз некаторы час атрымаў пасаду бухгалтара. Адначасова Брайцаў узмоцнена вывучае рускую мастацкую літаратуру і ўвесь свабодны час займаецца ў Румянцаўскай бібліятэцы. Менавіта, у гэты час ён здолеў атрымаць адукацыю. Піша вялікую аповесць "Богачи. Повесть из белорусской простонародной жизни", якая выйшла з друку ў 1889 годзе (друкавалася ў друкарні Кушнерава). У гэтым творы аўтар дае мастацкі і праўдзівы малюнак сялянскага жыцця ў паслярэформеннай магілёўскай вёсцы. Акадэмік Я.Ф. Карскі ў 3 выпуску III тома сваёй працы "Беларусы" (1922г.) адзначыў гэты твор як "талантливую повесть".

Брайцаў піша рад іншых аповесцей: "Невдашечка Анюта" (1887 г.), у назве якой, каб адзначыць мясцовы каларыт, ужывае беларускае слова "невдашечка" замест звычайнага рускага "неудачница", "Старая деревня" і другія, якія апісваюць побыт і тыпы роднага сяла і павятовага горада Клімавічы ў 1870-х гадах.

Набыўшы грошы праз службу і выданне "Богачей", Якуб Раманавіч аказваў матэрыяльную дапамогу сваім двум братам, якіх выпісаў з глухога кутка Беларусі і даў ім вышэйшую адукацыю.

Зрэшты, заробак яго працяглы час быў не пятнаццаць і не сорак, а пяцьсот рублёў у месяц. Гэта была вяршыня, кульмінацыйны пункт у матэрыяльным знаходжанні Брайцава. Сваё жыццё ў гэты час ён называў раскошным.

Па сваёй натуры ён быў неспакойным чалавекам, і дзейнасць бухгалтара яго не задавальняла. Ён пазнаёміўся з рускімі пісьменнікамі, нярэдка навед-



■ Якаў Раманавіч БРАЙЦАЎ

ўдавалася паспеўшаму прызывачаіцца да спакусаў вялікага горада пісьменніку. Яна паступова прыходзіла ў заняпад.

Бацька пакінуў у спадчыну сваім сынам два надзелы зямлі ў сяле і набытыя ад распродажу Забялышынскага маёнтка дванаццаць дзесяцін пад лесам, хмызняком і часткова пад лугам. Малодшыя браты Якава Раманавіча – Іван і Васіль Раманавіч - на бацькаву спадчыну не спадзяваліся. Іван у той час меў дом, вучонае званне прафесара матэматыкі, а Васіль - дацэнта медыцынскіх навук. Яны былі дастаткова забяспечаны і зямлёю не цікавіліся. Якаву Раманавічу дасталася толькі надзельная зямля, астатняя перайшла ў спадчыну да малодшай сястры тароў і рост кулацніцтва закранулі і Забялышын. У 1910-1911 гадах адбыўся падзел сяла на хутары. Брайцаў атрымаў хутар у 14 дзесяцін і назваў яго "Сярэдні". Аднак хутарская гаспадарка вялася дрэнна. Гаспадар больш займаўся судовымі справамі і часта наведваў валасныя ды павятовыя прысутствы.

У 1913-1916 гадах ён піша свой галоўны раман вялікі раман пад назвай "Среди болот и лесов", у якім апісвае жыццё беларускай вёскі і дзейнасць вядомага экспрапрыятара Аляксандра Савіцкага пад час першай рускай рэвалюцыі. На жаль, гэты вялікі і змястоўны твор, каштоўны з мастацкага боку, поўнасцю не захаваўся пасля смерці пісьменніка.

